
У
лясах
бела-
вежы

Тэкст АНАТОЛЯ КЛЫШКІ ● Малюнкі ВАЛЯНЦІНА БАРОЎКІ

У лясах Белавежы

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1975 г.



ШТО ТАКОЕ ПУШЧА?

Сказаць лес — мала.

Вы, пэўна, ведаеце, што такое бярэзнік: там, дзе растуць бярозы; хвойнік — дзе разгойдваюць сваё голле гонкія хвоі; ельнік — дзе імкнуць угару свае шапкі яліны. А ёсць яшчэ ў нашай Беларусі дубровы, асіннікі і шматшмат іншых лясоў.

Але пушча — гэта лес над лясамі, бяскрайняя, бязмежная. Сюды сабраліся, сышліся і перамяшаліся тут, у гэтым вялікім лесе, і бурштынавыя хвойнікі, і празрыстыя, беластвольныя бярэзнікі, і змрочна-хмурыя ельнікі, і шапаткія асіннікі, і задуменныя дубровы... Сышліся з рознаю сваёю зверыною, птаствам.

Белавежская пушча... Адзін з самых вялікіх лясоў на свеце.

Пройдземся па ёй! Але спачатку паглядзім на гэтую вежу, збудаваную даўным-даўно нашымі прадзедамі, якім прыходзілася тут змагацца, а часам і ратавацца за гэтымі мурамі ад чужынцаў.

Некалі пушча падыходзіла пад самую вежу. Цяпер лясы адступілі...

Белая вежа... Кажуць, па ёй і назва гэтай пушчы — Белавежская.

Самы славуты звер нашай пушчы — зубр. Вялізны. На выгляд можа здацца нязграбаю і марудаю. А між тым умее хутка бегчы і раптоўна спыняцца.

Дзе пройдуць ягоныя рогі між дрэў, пройдзе і сам зубр.

Гэты лясны велікан умее добра прабірацца між багны. Зубровыя сляды не раз выводзілі ў вайну лясных мсціўцаў з балота.

Зубр — ціхмяная жывёла. Ён ніколі не нападае першы. Але калі яго раззлаваць, то цяжка стрымаць. Бо зубр — самая дужая, самая магутная ў нас жывёліна. Тоўстае бервяно ён лёгка падкідае рагамі.

Нездарма зубр — на радыятары мінскіх аўтамабіляў. Гэта знак дужасці і сілы беларускіх машын.

Няшчадна, да крыві тне зверыну у летні дзень розная пушчанская заедзь. І для зуброў няма лепшага месца, чым пясчаныя «купальні». Жывот ад аваднёў схаваны ў пяску, а на спіне бегае пліска, вышукваючы мошкі ў зубровай поўсці.

Што ні кажы,— добрая расчоска — птушыная дзюба!



Ідзеш па пушчы і — не адарваць вачэй ад лясной красы: дуб, ясень, граб, хвоя, клён, бяроза, асіна, елка, чорная вольха.

Пушча ўсё новая і новая. У ёй няма аднастайнасці паўночнага таежнага лесу.

Плямістая шкурка аленяняці робіць непрыкметным яго на фоне покрыва пушчы — нібы яркія промні сонца, што прабіліся праз лістоту. Яна добра хавае малечу ад благога вока рысі ці забеглага ваўка.

Бо маці-аленіха не зможа ў бядзе ўратаваць ад драпежніка сваё дзіця. Яе самую ратуюць толькі ногі.

Але ў аленяняці ёсць у Белавежскай пушчы надзейныя абаронцы— зубры. І аленяня спяшаецца прыстаць да зубровага статка. Зубры самі не пакрыўдзяць малечу ды і другому каму таксама не дадуць у крыўду.

Лясны прыгажун — пушчанскі лось з сухою галінкаю рагоў. Узімку ён скінуў іх. І цяпер нібы засаромеўся, што аблысеў.

Завостраныя галоўкі дрэў, плаціна на рэчцы выдаюць месца жыхарства баброў-лесарубаў. А вось і сам гаспадар.



А што гэта? Пад дубам шышкі? Адкуль яны тут узяліся?

У расколіне між кары дуба дзяцел зрабіў «кузню». Заклініў там яловую шышку і носам тук-тук. Дастане семкі, а шышку спіхне ўніз. І зноў ляціць на яліну па новую шышку.

Дзяцел хоць і лясная птушка, а сядзець на галінках дрэў не прывык. Ён больш любіць поўзаць па кары і падпірацца хвастом. І лапкі ў яго як на тое: два пальцы ўперад і два — назад. Сама раз трымацца за шурпатую кару.

— Стук-стук,— аж разлягаецца ў пушчы ягоны моцны пошчак. Падзёўб, падзёўб і хуценька перабег на другі бок. Нібы ўпэўніцца хоча: ці не прадзёўб навылет дрэва?

Не. Дзяцел ведае: ад моцнага стуку звычайна выпаўзаюць з кары патрывожаныя розныя жучкі, чарвячкі, караеды.

Вось і будзе яму спажытак.

Дзяцел — карысная птушка. І не толькі таму, што знішчае шкоднікаў дрэў.

За сваё жыццё ён нарабіў шмат хатак розным птушкам — сінічкам, шпакам, сычам, мухалоўкам,— тым, што жывуць у дуплах.

Штогод дзяцел дзяўбе сабе пад жытло новае дупло, а старое аддае іншым.

Увесну, калі пад карою дрэў пачынае бруіцца сок, дзяцел кальцуе бярозу. Высока ўверсе — як бы знарок каб не зашкодзіць дрэву — востраю дзюбаю ён прабівае дзірачку і прагна п'е — не нап'ецца. Але, як бачыце, ласуецца не толькі сам.

Паспытаць салодкага бярозавіку прыляцелі мушкі, прыпаўзлі мурашкі, прысеў і матылькрапіўнік.



У зайчыхі вывеліся першыя зайчаняты. Вунь яны — пухнатыя клубочкі — сядзяць у ямцы пад кустом, прыціснуўшы вушы да спіны. Затаіліся. І дрыжаць — ад холаду і голаду.



Дзе цяпер іх мама? Можа, ужо далёка-далёка адсюль, у другім канцы пушчы. Можа, яе высачыў звер ці напалохала якая птушка. Хіба мала ворагаў у зайцаў?

Адзін паратунак малых — добры зайцавы звычай. Якая б зайчыха ні бегла тут, спыніцца і напоіць іх цёплым малачком.

Бо, можа, і яе дзетак у гэты час на другім канцы пушчы корміць іншая зайчыха-мама.

Цяжка паверыць, што гэтыя істоты ў паласаценькіх піжамках — заўтрашнія дужэзныя дзікі.

Вунь галка ўляпілася дзюбаю за тонкую галінку таполі і павісла. Крохкая галінка хруснула і абламалася. Галка тут жа панесла яе на гняздо.

Але што за гняздо з цвёрдых галінак? Вось бы разжыцца на мяккую поўсць, каб выслаць гняздо.

Бачыце? Шпак гоніцца за вавёркаю — гэтым жывым клубком воўны. Імгненне — і поўная дзюба поўсці!

Мякка будзе маленькім шпачкам...

Некаторыя звяркі зусім не ўцякаюць ад птушак. Увесну яны ліняюць, і ім прыемна, калі тыя скубуць з іх поўсць.

Івалга падвешвае гняздо на галіну, і яе дзяцей люляе вецер.

А ў ластаўкі-беражанкі і блакітнага зімародка замест звычайных гнёздаў — норы.

Янот — вораг наземных гнёздаў. Знішчае птаства, калі яно яшчэ ў яйках.

Рысь толькі што схавала сваё злачынства. Пад гэтым лісцем — недаедзены ёю алень.

Ліс, напаткаўшы ў лесе здохлую жывёліну, не праміне, каб не вымазацца аб яе.

Многія звяры, на якіх палюе ліс, яшчэ здалёк чуюць ягоны пах. Падкрасціся да іх не так проста лісу. Вось і мажацца ён аб здыхляціну — з галавы да хваста пэцкае сваё прыгожае футра, хоча ўтаіць драпежны лісіны дух.

Бо чаго ж звярам баяцца нежывога?

Што мёртвае, тое не кусаецца.

Б'е ў нос здыхатою, кепска пахне і самому лісу, але церпіць. Трэба насіць непрыемны пах на сваёй шкуры, калі хочаш есці чужое мяса.



Ад гэтай сустрэчы адзін астанецца мёртвы.

Моцным бізуном свайго цела вуж заўсёды забівае гадзюку насмерць.

Як бы за тое, што самому вужу часта даводзіцца расплачвацца за крыўды гадзюкі. Сёй-той з недасведчаных людзей блытае бяскрыўднага вужа і ядавітую гадзюку.

Хай не палохае вас страшны раздвоены язык вужа і яго сыканне. Ведайце: вуж бяскрыўдны.

Але памятайце пра чорны зігзаг небяспечнай гадзюкі, укус якой часам смяротны для чалавека.

Вы, напэўна, угадаеце, хто гэта.

Не ведаеце? Кажаце, нейкі чорны бусел.

Дык угадалі! Сапраўды, гэта чорны бусел — рэдкая цяпер на свеце птушка.

А гэта жыхар пушчанскіх балот.

Вясною, выбіраючы сабе сяброваК, турухтан надзвычай прыгожы. Сярод соцень не знойдзеш хоць бы двух, у якіх былі б аднолькавыя фарбы пер'яў.

Але як ні ўглядайся — усё роўна праз год не пазнаеш яго. Які б ні быў прыгожы ўбор, на другую вясну будзе іншы,— турухтан штогод мяняе сваю афарбоўку.

І толькі турухтанкі заўсёды аднолькава шэранькія.

Пушчанскі арол са сваёю здабычаю.

Не, гэта не жар-птушкі з казкі. Гэта жывыя фазаны, якія нядаўна абжыліся ў пушчы.



Белавежская пушча неаднойчы памагала нашым продкам бараніць сваю бацькаўшчыну, засланяла іх ад ворагаў, апранала, карміла.

Гэты дуб, які не абхопяць і пяць чалавек, узяўшыся за рукі, пэўна, памятае, як у даўнія часы, выбіраючыся на рашучую бітву з тэўтонскімі рыцарамі, нашы прадзеды тут праз усю восень і зіму рыхтавалі сабе мяса тураў, зуброў, ласёў, аленяў, дзікоў,— тысячы бочак.

Тура ўжо няма. Ні тут і нідзе на свеце. Чатыры стагоддзі назад яго знішчылі прагныя да нажывы паны. Пазней яны выразалі нашу пушчу, сплаўляючы па рэках за мяжу хвоі на мачты чужых караблёў. Праз іх ледзь не загінуў апошні зубр.

Дзікія звяры не нашкодзяць так, як умеюць дзікія людзі, што не любяць пушчы: яе дрэў, птушак, жывёлы.

Сёння Белавежская пушча — запаведнік.

Секчы дрэвы, паляваць на дзічыну тут няможна. Усякі звер, усякая птушка тут пад аховаю чалавека. Толькі ваўкам — гэтым лясным разбойнікам — уваход сюды забаронены.

Тут кармавая паляна. Іх шмат у Белавежскай пушчы. На іх для зверыны сеюць жыта, авёс, ячмень, канюшыну, проса, люцэрну,— кожнаму звяру, як пад заказ, на ягоны густ. Смачна есці!

Вось венікі, але не для падлогі.

Узімку яны — найлепшы корм зубрам, аленям, казулям.

Цяжка прыйшлося б вялікаму пушчанскаму жывёльнаму статку, калі б не ўвага чалавека.

Дзікі, як вядома, найбольш любяць бульбу. Тут для іх параскіданы бульба, буракі, морква.

У шмат якіх мясцінах пушчы спецыяльна для зверыны зроблены вадапоі, пакладзена соль.

Палізаць саланец прыйшла казуля.

Увесну, улетку, увосень і ўзімку — ніколі не моўкне ў пушчы птушыная песня. Свішча шпак, цінькае сінічка, стракоча сарока, кракае качка, буркуе голуб, кукуе зязюля, цёхкае салавей, клякоча бусел, курлыкае жораў.

Бел 2
У 11

На белорусском языке

В ЛЕСАХ БЕЛОВЕЖИ

Текст А. К. Клышко

Рисунки В. М. Боровко

Для детей дошкольного возраста

Рэдактар У. Г. Машкоў.
Мастацкі рэдактар В. П. Жыжэнка.
Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо.
Карэктар А. Т. Глушчанка.

Здадзена ў набор 23/VI 1975 г. Падп. да друку 5/XI 1975 г. Тыраж 176 000 экз. Фармат 84×90 1/16. Папера афс. № 2. Ум. друк. арк. 2,8. Ул.-выд. арк. 4,51. Зак. 2429. Цана 34 кап.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Савецкая, 19.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

У $\frac{70801\text{-}195}{М\ 302(05)\text{-}75}$ 178-76

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1975 г.


34 к.